сложности. Раздел контроля знаний содержит методические рекомендации по организации самостоятельной работы студентов, примерные тестовые задания по основным разделам курса, критерии оценки учебных успехов студентов, условия использования рейтинговой системы контроля знаний, перечень тем для реферирования и вопросов, выносимых на экзамен. Вспомогательный раздел включает учебную программу, перечень учебных изданий и информационно-аналитических материалов, рекомендуемых для изучения дисциплины (списки основной и дополнительной литературы).

Для повышения эффективности изучения дисциплины «Прикладная культурология. Раздел 1. Теория и история социально-культурной деятельности» рекомендуется использовать инновационные технологии для активизации учебной и научно-исследовательской деятельности студентов: метод малых групп, различные методики работы с текстом, проблемное обучение, игровые и проектные технологии, составление ментальных карт.

**В. М. Белакурскі,**
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі*
*гуманітарных навук*

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ КУРСА «ФІЛАСОФІЯ»

У сучасных умовах пераходу вышэйшых навучальных устаноў да кампетэнтнаснай мадэлі адукацыі і скарачэння аўдыторных гадзін значнасць самастойнай работы студэнтаў істотна ўзрастае. Як вядома, тая ці іншая кампетэнцыя фарміруецца ў працэсе засваення не толькі спецыяльнай вучэбнай дысцыпліны, а цэлага комплексу інтэрдысцыплінарных ведаў, уменняў і навыкаў. Вучэбныя курсы прафесійнага цыклу, як правіла, выклікаюць у студэнтаў пераважна пазнавальны інтарэс, а важнасць агульнагуманітарных дысцыплін, такіх як «філасофія», яны працягваюць недаацэньваць, таму самастойная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў па філасофіі нярэдка ідзе па астаткаваму прынцыпу. Для студэнта не заўсёды з'яўляецца віда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вочным тое, што філасофскія веды выконваюць рашаючую ролю ў фарміраванні цэласнай карціны свету, а філасофскія законы і катэгорыі, дзякуючы свайму ўніверсалізму, знойдуць прымяненне ў розных відах яго дзейнасці, ад побытавай да творчай. Менавіта таму неабходна такая арганізацыя самастойнай работы па вывучэнні філасофіі, якая б вабіла студэнта, садзейнічала павышэнню яго матывацыі да засваення матэрыялу і актывізавала запатрабаванасць філасофскіх ведаў.

Значная частка студэнтаў сёння мае недастатковы ўзровень пазнавальнай матывацыі. Дадзеная катэгорыя пераважна арыентавана на так званыя інструментальныя каштоўнасці. Філасофскія веды для іх не маюць пэўнага сэнсу, паколькі пакуль яшчэ не бачацца ў канкрэтным прымяненні да будучай прафесійнай дзейнасці.

Вышэйшая адукацыя, якую атрымлівае студэнт БДУКМ, – гэта перш-наперш адукацыя культуралагічная, якая закладвае аснову бесперапыннай самаадукацыі маладой асобы ў сучасным дынамічна зменлівым грамадстве. У гуманітарных навуках дастаткова выразна праводзіцца кірунак да духоўных асноў чалавека і грамадства, таму ў іх дамінуюць устаноўкі на класічныя ўзоры інтэлектуальнай культуры і агульначалавечую духоўную спадчыну.

Падкрэслім, што паміж агульнай культурай асобы і яе самаразвіццём існуе непарыўная сэнсавая ўзаемасувязь. За паняццем «агульная культура» мы бачым натуральнае імкненне да сістэматычнага, інтэрдысцыплінарнага навучання. Недастатковасць агульнай культуры цягне за сабой не толькі паніжэнне творчага ўяўлення студэнта, але і належнай здольнасці пераходзіць ад аднаго віду дзейнасці да другога. Сёння гэтаму, на жаль, садзейнічае замена культуры разважання культурай пачуццёвых вобразаў, якія зніжаюць інтарэс да логасу. Большасць сучасных студэнтаў не чытае філасофскую і грамадска-палітычную літаратуру. «Разуменне» грамадскіх праблем прыходзіць да іх з экранаў TV, інтэрнэту, а таксама газетных старонак. Зразумела, што да паглыбленага абмеркавання філасофскіх праблем, гістарычных з’яў ці сучасных палітычных працэсаў такая аўдыторыя ўсё часцей аказваецца непадрыхтаванай.

У свой час Цыцэрон адзначаў, што «культура розуму ёсць філасофія», а «філасофія – самы шчодры, самы лепшы дар

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бессмяротных багоў, прынесены імі чалавеку» [4, с. 11]. Безумоўна, працэс авалодання філасофіяй непасрэдна садзейнічае развіццю ў студэнцкай моладзі абстрактнага, тэарэтычнага мыслення. Аднак ужо першае знаёмства студэнта з вучэбнай літаратурай па філасофіі або арыгінальнымі філасофскімі тэкстамі, уключанымі ў планы семінарскіх заняткаў («Пір» Платон, «Час і існасць» М. Хайдэгера і інш.), выклікае цэлы шэраг цяжкасцей. Студэнту патрабуецца даволі шмат часу, а таксама цярпення, каб самастойна ўнікнуць у логіку філасофскіх падзей, змест філасофскіх паняццяў і правільна ўжываць апошнія ў аўдыторнай дыскусіі. Найважнейшай першапачатковай умовай тут выступае руплівая прапрацоўка ўсіх асноўных палажэнняў канкрэтнай тэмы па падручніках, тэкстах лекцый і рэкамендаваных першакрыніцах. Для гэтага першнаперш патрабуецца выразна і дастаткова поўна сфармуляваць мэты і задачы вывучэння філасофскага тэксту. Па магчымасці студэнт павінен вызначыць тыя пытанні, на якія б ён хацеў атрымаць адказы, выкарыстоўваючы адпаведны паняццевы апарат, а таксама асноўныя філасофскія катэгорыі. Патрабуецца вельмі ўважліва «ўчытацца» ў аналізуемы матэрыял, не дапускаючы паспешлівага і скажонага яго ўспрыняцця. Пры гэтым мэтазгодна рабіць невялічкія тэзісы або анатацыі, якія б замацоўвалі прачытанае.

Адзначым, што часам узнікае сітуацыя, калі студэнт імкнецца перавесці філасофскія катэгорыі на мову паўсядзённай свядомасці, г. зн. стараецца зразумець іх сэнс пры дапамозе звыклых схем. Так наўмысна адбываецца прыніжэнне філасофіі да ўзроўню так званага «здаровага» сэнсу і нават адмаўленне ў філасофскіх ведах наогул якога-небудзь сэнсу. Яшчэ адна тыповая сітуацыя, з якой можа сутыкнуцца выкладчык, заключаецца ў тым, што студэнт знаёмы з філасофскім матэрыялам, але не разумее яго або разумее недастаткова, г. зн. успрымае гэты матэрыял фармальна, як шэраг нейкіх абстрактных палажэнняў, «рэчаў у сабе». Асваенне студэнтам філасофскай думкі павінна насіць катэгарыяльна-функцыянальную накіраванасць, г. зн. быць арганічна звязаным з фарміраваннем і развіццём асноватворчых катэгорый філасофіі: «матэрыя» – «свядомасць»; «існасць» – «нябыт»; «дыялектыка» – «метафізіка»; «суб’ект» – «аб’ект»; «прадмет» – «метад» і г. д. Студэн-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ту вельмі важна ўсвядоміць, што для правільнага прымянення дадзеных катэгорый неабходна ведаць, што яны сабой уяўляюць, у чым іх адрозненне ад матэрыяльных прадметаў, як з іх дапамогай можна разумець апошнія. Разуменне – гэта працэдура, дзякуючы якой дасягаецца спасціжэнне сэнсу. «Чаго вы не разумееце, тое вам не належыць» (І. Гётэ). З першапачатковых элементарных намаганняў-роздумаў студэнта над матэрыялам паступова разгортваецца той ланцуг разумення, які пачынаецца самым павярхоўным расчляненнем канкрэтных фактаў матэрыяльнага свету і затым уздымаецца да вяршынь сэнсажыццёвых пытанняў і сваіх спроб адказу на іх. Ніякая дапамога звонку не зможа замяніць яму гэтых асабістых намаганняў.

Сёння для даволі значнай часткі студэнтаў па-ранейшаму актуалізуецца патрэба авалодання культурай чытання. Апошняя выступае не толькі своеасаблівым падмуркам самаўдасканалення, але і бесперапыннага працэсу самаадукацыі. Культура чытання – гэта комплекс навыкаў у рабоце з кнігай, якія ўключаюць выбар тэматыкі, сістэматычнасць і паслядоўнасць чытання, валоданне тэхнічнымі прыёмамі, звязанымі з замацаваннем, а таксама выкарыстаннем прачытанага, пранікненне ў сутнасць кнігі або артыкула.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы, распрацаванымі на кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук БДУКМ, з’яўляюцца падрыхтоўка творчых заданняў з наступным напісаннем эсэ, дакладаў і рэфератаў, вывучэнне артыкулаў па філасофскай праблематыцы, а таксама састаўленне анатацый, рэцэнзій, аналітычных запісаў і г. д., рашэнне філасофскіх задач з прэзентацыяй вынікаў. Вывучэнне асобных раздзелаў курса рэкамендавана праводзіць у наступнай паслядоўнасці: знаёмства са зместам тэм; вывучэнне літаратурных першакрыніц, канспекціраванне матэрыялу; кансультацыі з выкладчыкам; самастойнае раскрыццё тэмы. Выкананне самастойнай работы студэнтам уключае наступныя этапы: выбар тэмы даклада, эсэ або рэферата; падбор вучэбнай і навуковай літаратуры. Аналіз літаратуры прадугледжвае выдзяленне тых параграфаў і раздзелаў, матэрыял якіх прадстаўляе асобны інтарэс для раскрыцця тэмы. Вывучэнне літаратурных крыніц таксама звязана з канспекці-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раваннем асноўных палажэнняў тэксту. Варыянты канспекціравання могуць быць разнастайнымі: кароткі ці разгорнуты канспект, тэзісы, падбор цытат і г. д. Вынікам павінна стаць лагічна пабудаваная сістэма звестак па сутнасці даследаванага пытання. Мэтазгоднай з'яўляецца такая методыка выканання работы, калі напачатку студэнт рыхтуе яе чарнавы варыянт. Гэты тэкст уважліва перачытваецца, аналізуецца і рэдагуецца. У яго ўносяцца пэўныя змены, дапаўненні і адпаведныя карэктывы. Важна таксама вызначыць аб'ект і прадмет даследавання, яго мэту і задачы, рашэнне якіх накіравана на дасягненне неабходных вынікаў. У асноўнай частцы патрабуецца прадставіць аб'ектыўны і ўсебаковы аналіз праблемы. У заключэнні прыводзяцца асноўныя вынікі даследавання. Увагі патрабуе таксама спіс выкарыстаных крыніц, які павінен адпавядаць неабходным патрабаванням.

«Асмельцеся мысліць самастойна», – заклікаў некалі сваіх сучаснікаў Ф. Вальтэр. Па сутнасці, гэты заклік не страціў сваёй актуальнасці і сёння.


1. *Вербицкий, А. А.* Личностный и компетентностный подходы в образовании: проблемы интеграции / А. А. Вербицкий, О. Г. Ларионова. – М. : Логос, 2010. – 336 с.

2. *Ильин, Е. П.* Мотивация и мотивы / Е. П. Ильин. – СПб. : Питер, 2011. – 512 с.

3. Современные образовательные технологии : учеб. пособие / коллектив авторов ; под ред. Н. В. Бордовской. – М. : КНОРУС, 2015. – 432 с.

4. Цицерон. Философские трактаты / пер. М. И. Рижского. – М. : Наука, 1985. – 384 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ